# Запрашае «Сталічны экспрэс»

**Паслугамі Дзіцячай чыгункі імя К. С. Заслонава ў маі скарысталіся 6427 пасажыраў.**

Нагадваем, у летнім сезоне (чэрвень — жнівень) цягнік будзе курсіраваць па серадах, чацвяргах і пятніцах і рабіць шэсць рэйсаў (у 11.00, 11.38, 12.18, 12.57, 13.35, 14.14), а па суботах і нядзелях — з 11.00 да 16.47 і рабіць дзесяць рэйсаў (у 11.00, 11.38, 12.18, 12.57, 13.35, 14.14, 14.52, 15.31, 16.09, 16.47). Ён правязе пасажыраў па традыцыйным маршруце ад станцыі Заслонава да станцыі Сасновы Бор і назад.

У верасні здзейсніць падарожжа на «Сталічным экспрэсе» можна будзе па суботах і нядзелях. Цягнік будзе рабіць шэсць рэйсаў (у 11.00, 11.38, 12.18, 12.57, 13.35, 14.14, 14.52, 15.31, 16.09, 16.47).

З мэтай захавання здароўя юных пасажыраў, прафілактыкі распаўсюджвання вірусных інфекцый, а таксама стварэння камфортных умоў праезду ў цягніку «Сталічны экспрэс» прадугледжана рассаджванне з улікам сацыяльнай дыстанцыі. Акрамя таго, на працягу ўсяго дня праводзіцца санітарная апрацоўка рухомага саставу.

Наведвальнікам Дзіцячай чыгункі неабходна абавязкова выконваць масачны рэжым. Продаж масак арганізаваны на вакзале станцыі Заслонава.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**